# Вуліца імя Івана Чуклая

ДОБРА сёння прайсціся па вуліцах маладога шахцёрскага горада Салігорска. Прамыя, залітыя сонцам, упрыгожаныя зелянінай, яны вабяць і радуюць кожнага. А побач вежавыя краны ўзмахнулі высока ў неба свае стрэлы — там будуюцца высокія дамы, а з імі і новыя вуліцы.

Чытаем таблічку: «Імя Івана Чуклая». Кожны салігорац, ды і тыя, хто сюды прыязджае, ужо многае чулі пра подзвіг адважнага камсамольца-партызана, зроблены ім непадалёку ад Салігорска ў жніўні 1942 года.

Разграміўшы варожы гарнізон у мястэчку Пагост, партызаны вярталіся на сваю базу. І тут натрапілі на варожую засаду. Завязаўся кароткі, але жорсткі бой. Прыкрываючы сваім целам камісара атрада Мікіту Бандараўца, загінуў любімец партызан камсамолец Іван Чуклай. Ён пасмяротна ўзнагароджан ордэнам Леніна.

Цяпер яго імя носіць не толькі адна з вуліц, але і будаўнічая брыгада Леаніда Міхайлавіча Якубава. Нямала зрабілі маладыя рукі будаўнікоў. Універмаг, сталовая, камбінат бытавога абслугоўвання — вось далёка не ўвесь пералік таго, што пабудавалі чуклаеўцы.

Калі ж вы сёння хочаце даведацца да працавітых будаўнікоў, то прайдзіце на пляцоўку будучага рамеснага вучылішча. Вы ўбачыце, як завіхаюцца юнакі і дзяўчаты, узводзячы вучэбныя карпусы і майстэрні.

Тут працуюць Валодзя Мартыновіч, Ніна Галяс, Іван Світаў і многія другія. Яны не толькі выконваюць даведзеныя нормы выпрацоўкі, але значна перавыконваюць іх.

Ужо ёсць рашэнне занесці гэты дружны калектыў у Кнігу гонару Мінскага абкома камсамола.

Подзвігі герояў не забываюцца. Змагаючыся з лютым ворагам, Іван Чуклай марыў пра светлае будучае, уяўляў сабе яго такім цудоўным, якім яно ёсць сёння.

**Ул. ШКРАБА,**
**выхавацель маладзёжнага інтэрната.**
**г. Салігорск.**